Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 35 (505) | Субота, 1 снежня 1962 г. | Цана 1 кап.

РАБОТА ГРУПКАМСОРГА

Што і казаць, кожны з нас, паступаючы ва універсітэт, марыў не толькі аб ведах, якія ён атрымае, але і аб баявым, кіпучым камсамольскім жыцці. І што ж? Вучымся год, другі, а сапраўдны агенчык не заўсёды знойдзеш. Возьмем хаця б работу ў групах — асноўнае, што вызначае камсамольскае жыццё. Акрамя неравыбарчых і справаздачных сходаў, палітінфармацый ды традыцыйных культпаходаў у кіно і тэатр нічога ў групах не праводзіцца, калі не лічыць збору членскіх узносаў, які дарэчы, далёка не бездакорны. Часта ходзяць нашы камсоргі і патрабуюць: «Уплаці, калі ласка». Цяпер устанавілі тэрміны: 17 чысло кожнага месяца. Пры ўнясенні камсамольскіх узносаў трэба абавязкова прад'яўляць членскі білет. Але пакуль ўсё гэта толькі на паперы ў рашэннях бюро. А добра б такое ўбачыць на курсах!

Так, сумна жылося ў нас. Я кажу — сумна, таму што вельмі хочацца бачыць, што сум застаўся ў мінулым. Толькі крышачку фантазіі — і колькі цікавага можна правесці ў групах! Гэта дыспуты і гутаркі на самыя разнастайныя тэмы: «Савецкія паэты і кампазітары аб космасе і касманаўтах», «Навіны навукі і тэхнікі», «А в нашей буче, боевой, кипучей...», «Мірны атам» і г. д. Усё гэта трэба праводзіць на камсамольскіх сходах, на тых жа палітінфармацыях, толькі трэба ўдыхнуць у іх жыццё.

Чаму б, расказваючы аб палажэнні ў Англіі ці Францыі, не пагаварыць заадно аб сучаснай літаратуры гэтых краін (вельмі цікавыя артыкулы друкуюцца на старонках літаратурных газет і часопісаў).

А ці ж нельга правесці вялікую размову аб нашых аднагодках і нашых сучасніках?! Як шматгранна жыццё ў наш час, як поўнае яно вялікімі і маленькімі падзеямі! І вельмі шкада, што многае-многае праходзіць міма нас.

Я думаю, не варта спрачацца аб тым, трэба ці не трэба сачыць матэматыку, фізіку, хімію за навінкамі літаратуры і мастацтва. Чалавеку ўсё неабходна. Калі аб гэтым будзе гаварыцца ў групах, калі будзе там цікава, мне здаецца, гэта прамы заклад таго, што групы будуць дружнымі. Будзь у нас дружны калектыў, ведай мы, што каго хвалюе, хто чым цікавіцца, ніколі не праводзіліся б у нас пасяджэнні бюро з разборам персанальных спраў камсамольцаў, не прыйшлося б вывешваць на дошкі аб'яў выпіскі з пратаколаў з вымовамі, не чырванелі б на пасяджэннях камітэта камсоргі курсаў, калі давалі справаздачу аб рабоце, якая, па сутнасці, не праводзілася, і, нарэшце, жыць стала б куды цікавей!

Святлана КАНДРАЦЬЕВА,
член камітэта камсамола факультэта.

У НАШУ КАРЫСЦЬ

Гэта цікавая сустрэча пачалася і закончылася зусім нечакана. Усе «ігракі» сустракаліся паміж сабою вельмі шмат разоў і, натуральна, добра вывучылі характары і манеры адзін аднаго.

Дора Ільінічна Платнер дала сігнал да пачатку гульні. Усе хутка раздзяліліся на дзве каманды: правую і левую. Абедзве каманды мелі ў сваім складзе вельмі моцных іракоў, якія на працягу трох гадоў навучання дабіліся істотных поспехаў у вывучэнні англійскай мовы. Пакуль яны яшчэ не зусім добра засвоілі вымаўленне, але, як кажуць, алфавіт ведаюць.

Размінка пачалася даволі вяла. Але потым атмасфера стала напружанай. Каманды смела ўступілі ў гульню, умовы якой былі такія: Дора Ільінічна задае пытанне; калі каманда адкажа, то атрымоўвае «плюс».

Перавага правай каманды. Атрымаўшы першы «мінус», яна не разгубілася, а кінулася ў бой. Цяжкае пытанне, але дакладны адказ — «плюс», яшчэ пытанне— яшчэ «плюс». І яшчэ, і яшчэ.

Некалькі «плюсоў» заваявала і левая каманда. Гэтае цікавае спаборніцтва закончылася з лікам... у нашу карысць. Усе думалі, усе адказвалі, усе атрымалі новыя веды.

Я расказала аб адным з заняткаў групы англійскай мовы, які праводзіла Д. І. Платнер. Дора Ільінічна заўсёды цікава праводзіць заняткі. Яна ўкладае ў сваю справу ўсю душу.

Вось нам і захацелася падзяліцца сваімі ўражаннямі. А як у вас праводзяцца заняткі, студэнты іншых факультэтаў?

Тамара ПАТАПЕНКА,
студэнтка 4 курса.

Прыязджай да нас, Пеця!

19 лістапада другакурснікі матэматычнага факультэта праводзілі свайго таварыша Пятра Крука ў армію. Аб гэтай падзеі мала хто ведаў, але сам Пеця Крук і мы, яго сябры-аднакурснікі, надоўга яго запамяталі. Як ніколі мы зразумелі, якая вялікая дружба звязвае ўсіх нас.

Гэта быў цудоўны вечар! Шмат пажаданняў, жарты, смех, весялосць з невялікай прымессю суму — цяжка развітвацца з чалавекам, які быў для нас ўсіх добрым таварышам, а для многіх і сябрам.

Ён перапыніў вучобу, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак перад Радзімай. Развітаючыся, мы сказалі яму: «Будзь заўсёды чэсны і мужны, абавязкова вяртайся на матфак. Няхай ты і твае аднагодкі будуць апошнімі, каму прыдзецца апрануць ваенную форму!».

Таццяна МЕРКУШАВА,
студэнтка 2 курса.

Эдуард ШВАРЦ,
студент 1 курса.

* * *

Люди вселенной! Я к вам обращаюсь:
Снова над миром нависла война.
Так не допустим, чтоб бомбы взрывались,
Чтобы погибла родная земля.

Мало ли крови народной пролито?
Мало ль на свете осталось сирот?
Раны минувшей войны не зажиты,
Их никогда не забудет народ.

Тесно сомкнувший ряды воедино,
Голос народов над миром звучит:
«Мы не дадим повторить Хиросиму,
В мире и дружбе мечтаем мы жить».

Нет! Никогда не допустят народы,
Чтобы опять разразилась война,
Чтоб повторились те страшные годы,
Чтобы страдала родная земля.

Пачынаючы з гэтага нумара на старонках нашай газеты будзе апублікавана серыя ма тэрыялаў, падрыхтаваных д друку рэдкалегіямі насценны газет факультэтаў.

Штампы і аб тым, як іх пазбегнуць

На ўсіх курсах, ва ўсіх групах праводзяцца палітінфармацыі. У адных вельмі цікава, у іншых жа—сумна. А як яны праводзяцца ў вас, спытаеце вы? Я раскажу.

Спачатку Валя Шчалкун расказала аб важнейшых міжнародных падзеях, потым Мікалай Шчарбакоў пазнаёміў нас з работай Пленума ЦК КПСС. З вялікай цікавасцю праслухалі студэнты цікавыя навуковыя факты, сабраныя Фёдарам Янчанкам.

Было цікава, але... шаблонна. Мы часта гаворым у апошні час аб штампах, аб тым, як іх пазбегнуць. Прыдумваем арыгінальныя тэмы, для сходаў, дыспутаў, гутарак, складаем цікавыя планы, стараемся, каб ўсё запісанае ў іх не заставалася на паперы.

Але адзін бок работы, асаблі важны для нас, матэматыкаў, м пакінулі без увагі. Не сакрэт ж што ў многіх студэнтаў-матэмат каў адсутнічае культура... матэм тычная. Гэта гучыць парадаксал на, але факт застаецца фактам. нам трэба яго ліквідаваць. Я Можна арганізаваць гурток вывучэнню гісторыі матэматы адпаведныя семінары. Але ў гэта ў шырокім масштабе. А групах добра б паслухаць дакл ды саміх студэнтаў аб жыц і дзейнасці выдатных рускіх, с вецкіх і замежных матэматыка гутаркі аб развіцці матэматыкі старажытныя часы, у іншых кра нах і г. д.

Міхаіл БЕКЕР,
студэнт 4 курс

Наша група...

Яшчэ зусім нядаўна гэта былі дзяўчыны, вельмі незадаволеныя тым, што пасля года сумеснай вучобы прыйшлося развітацца з групамі, ужо стаўшымі сваімі. Я таксама была вельмі незадаволена гэтай зменай. Але прайшло некалькі часу, і цяпер можна сказаць зусім іншае. Непрыкметна мы вельмі пасябравалі. Гэта бачна хаця б па тым, як пасля лекцый або на перапынках мы не спяшаемся разбегчыся хто куды.

Мы імкнемся зрабіць жыццё як мага цікавейшым. А ў гэтым зацікаўлены ўсе. Таму нам тое-сёе ўдаецца зрабіць. Палітінфармацыі ператварыліся ў вялікія агляды навінак літаратуры, навукі і, зразумела, палітычнага жыцця. Яны праходзяць вельмі жыва, весела (менавіта весела!) і цікава. Цяпер мы рыхтуемся да дыспута аб творчасці Яўгенія Еўтушэнкі, хутка Света Кандрацьева раскаж нам аб творах мастакоў-перасо нікаў.

Мы знаходзім час на многа Тамара Саўчанка, Света Кандр цьева, Валя Гаварытава — ка самольскія важакі. Люся Новіка абараняе гонар універсітэта баскетбольных пляцоўках. Ва Фрыдман — член секцыі маста кай гімнастыкі. Таня Кісель баяністка аркестра народных і струментаў. Наш адзіны юнак В ня Скаскевіч — пастаянны ўдзел нік канцэртаў мастацкай сам дзейнасці.

Зразумела, не ўсё ў парадку групе, але галоўнае, што мы ўс жадаем, каб было лепш. І толькі жадаем, але і робім.

Ірына ГІТЭЛЬЗОН,
студэнтка 1 групы 2 курс

Дзесяць мінут штодзённа

Кожную раніцу шумны натоўп студэнтаў запаўняе калідоры галоўнага корпуса. Прылій пачынаецца ў 8.40. Не зачыняюцца дзверы, упускаючы новыя партыі студэнтаў. Шум, жарты, смех. Але варта кінуць позірк на гардэроб, як смех змяўкае. Так, тут ужо не да смеху. Гардэроб вялікі, светлы, чысты. Могуць распрануцца ўсе, але не паспяваюць. А стрэлка гадзінніка няўмольна пайзе да дзевяці. І ажыўленне спадае.

Студэнты, якія стаяць у чарзе, пачынаюць адчуваць, што зноў спозняцца. Звініць званок. Выкладчыкі расходзяцца па аўдыторыях. А яны напалову пустыя. студэнты стаяць ля вешалкі. На лесвіцы адбываюцца цуды. Там студэнты спаборнічаюць у бегу.

Калі падлічыць, колькі чалавек спазняецца кожны дзень і склас мінуты, атрымаецца астранамічна лічба.

З гэтым трэба змагацца. Як «На зеркало нечего пенять, кол рожа крива», — гаворыць руска прымаўка. А мы гаворым: «Н адміністрацыю не ківай, калі са вінаваты». Зразумела, гэта дрэнн калі гардэробшчыца блытае н маркі. Але больш вінаватыя сам студэнты. Далёка жывеш — вы дзі параней — не спазнішся. тыя, хто жыве ў інтэрнаце? В ўсякім выпадку, дзяжурныя п паверхах няхай будзяць усіх адзін час, каб ніхто не праспа

Гардэробшчыцы не спраўляюц ца — няхай старасты курсаў вы дзяляць дзяжурных, а тыя прыхо дзяць на паўгадзіны раней і дапа магаюць прымаць паліто ў студэн таў. У школах так і робяць, і ні хто не спазняецца. Гэта прымі тыўны, але верны спосаб пазбавіц ца ад спазненняў.

Ганна ФРЫДМАН,
Анатолій ВАСІЛЕВІЧ.

Гэтую старонку падрыхтавала да друку рэдакцыйная калегія насценнай газеты матэматычнага факультэта

„РЕШИМ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ“

За пастаянны кантакт

Адным з важнейшых участкаў у рабоце палітыка-выхаваўчых сектараў факультэцкіх бюро і камітэта камсамола з'яўляецца падпіска на перыядычны друк. Газеты і часопісы адыгрываюць вялікую ролю ў палітычным выхаванні мас, і таму на адказных за гэты ўчастак работы кладзецца вялікая задача. Але аднаму адказнаму па факультэту справіцца з гэтай задачай вельмі цяжка, а часта і немагчыма. Для яе выканання неабходна выкарыстаць усе сілы, ускрыць усе рэзервы і магчымасці.

У нас ва універсітэце яшчэ дрэнна арганізавана падпіска на некаторыя рэспубліканскія выданні, напрыклад, на газету «Чырвоная змена». Добра, калі з першага захода ў падпісных лістах будзе 60 працэнтаў лімітаванай колькасці экземпляраў. Часта даводзіцца, не адносячы лісты ў «Саюздрук», вяртаць іх на курсы і патрабаваць, каб там праводзілі неабходную работу.

У крытычныя моманты адказны за падпіску на факультэце вымушан прасіць дапамогі ў факультэцкага бюро і адрываць членаў бюро ад іх работы. З боку ж Глебава (адказнага за падпіску ва універсітэце) нічога не прадпрымаецца, акрамя адпаведнага націску на адказных па факультэтах, відавочна, з тым разлікам, каб тыя ў сваю чаргу націскалі на адказных па курсах, тыя — на групоргаў, а групоргі на студэнтаў. Такі метад работы не апраўдвае сябе, не прыносіць пажаданых вынікаў.

Давайце ж паспрабуем ускрыць прычыну, чаму падпіска на газеты зводзіцца, уласна кажучы, да падпісцы на «Чырвоную змену».

Многія студэнты растлумачваюць сваё нежаданне выпісваць «Чырвоную змену» тым, што, маўляў, гэтая газета нецікавая, шэрая і аднастайная. Гэтая прычына даволі важкая і павінна прымусіць нас прызадумацца. Неабходна зрабіць усё магчымае, каб газета стала для нас блізкай і цікавай.

Хто са студэнтаў 2 курса не памятае «Чырвоную змену» ад 19 сакавіка гэтага года? У тым нумары былі змешчаны заметка і здымак Івана Трухана аб нашых студэнтах-выдатніках Яўгеніі Харук і Антону Садоўскім, якія 18 сакавіка ўпершыню ў жыцці прагаласавалі за сваё шчаслівае юнацтва.

Гэтая падзея не засталася без увагі для нас, аднакурснікаў; на душы ва ўсіх было светла і радасна за сваіх таварышаў. Асаблівы настрой прыдавала тое, што многія даведаліся аб гэтым з нашай камсамольскай газеты.

І калі кожны нумар «Чырвонай змены» будзе чымсьці цікавы для нашых студэнтаў, то не будзе цяжкасцей пры падпісцы на яе.

Для гэтага трэба было б камітэту камсамола арганізаваць сустрэчу нашых студэнтаў з работнікамі рэдакцыі газеты, перыядычна праводзіць такія сустрэчы. Я думаю, што тыя і другія ахвотна згадзяцца на гэта. У рэдакцыі «Чырвонай змены» працуюць выпускнікі нашага універсітэта. Так чаму б з імі не падтрымліваць пастаянную сувязь?! Час ужо аб'яднаць нашы сілы!

Нядрэнна было б палітыка-выхаваўчыя сектары факультэтаў пазнаёміць з метадамі работы адпаведных сектараў у медыцынскім інстытуце і іншых ВНУ, дзе падпіска праводзіцца лепш, чым у нас. Адным словам, трэба прыкласці ўсе намаганні, каб «Чырвоная змена» стала любімай газетай нашай моладзі.

Мікалай ЮРЧУК,
студэнт 2 курса.

Да 85-годдзя з дня нараджэння вучонага

24 лістапада адбылося пашыранае пасяджэнне кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, прысвечанае 85-годдзю з дня нараджэння акадэміка Мікалая Міхайлавіча Нікольскага — буйнага вучонага-гісторыка, аднаго з заснавальнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

На пасяджэнні былі заслуханы паведамленні: дацэнта Р. А. Нікольскай на тэму «Навуковая дзейнасць акадэміка М. М. Нікольскага», настаўніка М. Б. Бацвінніка «Педагагічная дзейнасць і педагагічныя погляды акадэміка М. М. Нікольскага», студэнта 3 курса гістарычнага факультэта І. Акінчыца «Працы акадэміка М. М. Нікольскага ў галіне этнаграфіі Беларусі».

Паведамленні выступаўшых былі выслуханы прысутнымі выкладчыкамі і студэнтамі з вялікай увагай.

Б. МЕЛЬЦАР,
старшы. выкладчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

„НЕШЧАСЛІВЫ ПАКОЙ"

Пад такім загалоўкам у нумары 31 нашай газеты была надрукавана невялічкая заметка аб тым, што ў 13 пакоі інтэрната па вуліцы Дзімітрава жыхары, студэнты юрыдычнага факультэта не выконваюць элементарных норм прыгляду за санітарным станам пакою. Неўзабаве ў рэдакцыю прыйшлі двое з «герояў» гэтай заметкі і сталі патрабаваць, каб газета апублікавала абвяржэнне, бо ўсё гэта няпраўда, маўляў, у нас не было дрэнных адзнак за санітарны стан пакою. Абодва дэманстравалі веды законаў: «Мы можам падаць у суд за паклёпніцтва». І толькі ў канцы размовы, нарэшце, прадставіліся: Апалайка і Кісялёў.

А ў гэты час студэнцкі савет інтэрната правяраў факты. І ў рэдакцыю прыйшоў дакумент:

«Рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» ад студэнцкага савета інтэрната № 4 па вуліцы Дзімітрава.

З выпадку апублікаванай у Вашай газеце крытычнай заметкі «Нешчаслівы пакой», паведамляем, што факты, якія былі дазвены ў гэтай заметцы, адпавядаюць сапраўднасці (падкрэслена намі— Рэд).

Пакой № 13 (староста Кісялёў Аляксандр) сапраўды атрымаў за антысанітарны стан дзве нездавальняючыя адзнакі. Адну з іх паставіла камісія, якую ўзначальваў Свеціч Уладзімір, а другую — Карэба Мікалай.

Акрамя таго пакой № 13 атрымаў яшчэ адну двойку за антысанітарны стан 20 лістапада г. г., за што ўсе жыхары пакою будуць разбірацца на пасяджэнні прафбюро факультэта. Па санітарнаму стану гэта адзін з брудных пакояў у інтэрнаце і заслугоўвае самай вострай крытыкі.

Старшыня студэнцкага савета Ул. КАРАВАЙ».

Што мы можам дадаць да гэтага? На наш погляд, гэта вялікая тэма для размовы не толь на прафбюро факультэта, але для камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта.

Першынство па шашках

Пасля 10 тураў асабістага першынства Белсавета СДСТ «Буравеснік» па рускіх шашках лідзіруюць кандыдаты ў майстры В. Прыяткін і А. Вашкевіч. У іх па 8 ачкоў. На паўачка менш у студэнта 4 курса матфака БДУ А. Абрамовіча. Гэта вялікі поспех маладога шашыста. Па 6½ ачкоў у Г. Драбушэвіча і Ю. Струка. Трэба адзначыць поспех Ганны Хапалюк, якая ўпершыню выступае ў такім буйным турніры. Ва ўсіх партыях яна дэманструе сталую ігру. З 4½ ачкамі яна дзеліць 8—13 месцы з кандыдатамі ў майстры Сялянтай, Каганам, Каганерам і першаразраднікамі Мялешкай і Несцяровічам. Прыводзім партыю, дзе яна разграміла чэмпіёна медыцынскага інстытута Б. Клябанава (чорныя).

1. cb4 ba5 1. bc5 d:b4 3. a:c5 fg5
4. ed4 gf6 5. de3 gh4 6. ef4 fg5
7. ed2 g:e3 8. d:f4 cd6 9. ba3 d:b4
10. a:c5 dc7 11. fe3 h:f2 12. cb6

з разгромам.

НА ГАРАДСКІМ АГЛЯДЗЕ

Калі заслона адкрылася і зала глянула на нас тысяччу вачэй, усіх нас ахапіла хваляванне — на нас глядзелі выдатныя музыканты Беларусі, нават кампазітар—аўтар твора, які выконваў наш аркестр. Ды што мы? Наш кіраўнік Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын, які ўсё жыццё прысвяціў музыцы, які колькі разоў выступаў на гэтай жа сцэне, і той прыкметна хваляваўся.

Першыя аккорды «Сапажкоў» Туранкова. Зала заціхла, зала слухае. Аркестр гучыць зладжана, чыста, хоць некаторыя аркестранты захварэлі і не прыйшлі на канцэрт. Знікла і хваляванне.

Льецца вясёлая мелодыя беларускага танца, потым неўміручая музыка Чайкоўскага, яна змяняецца імклівым «Галопам» Семянякі. Скончылі — і ў зале успыхнулі дружныя апладысменты. Я гляджу на членаў журы, бачу, што і яны задаволена ўсміхаюцца. Да Міхаіла Аркадзьевіча падышоў кампазітар Юрый Семяняка і горача падзякаваў за выдатнае выкананне яго «Галопа».

Нядаўна стала вядома, што нашаму аркестру прысуджана першае месца на гарадскім аглядзе мастацкай самадзейнасці. Мы атрымалі дыплом першай ступені.

Я. КАЗЮКІН,
удзельнік аркестра народных інструментаў БДУ.

Камсамольскі сход

Камсамольскі сход. Як яшчэ часта мы фармальна падыходзім да яго правядзення! Таму і выступаючых на сходах бывае мала, і камсамольцы толькі аб тым і думаюць, як бы пахутчэй скончыўся ён. Але калі камсорг курса ці групы надае сходу сур'ёзнае значэнне, то і сход набывае сур'ёзны, дзелавы характар.

Трэба сказаць, што мы, камсамольскія работнікі, яшчэ не заўсёды даходзім да кожнага сакратара камсамольскай арганізацыі курса, групы, не заўсёды своечасова подказваем тэму сходу, а, бывае, дрэнна вучым камсорга яго рабоце, асабліва калі ён працуе ўпершыню.

Камітэт камсамола універсітэта праводзіць у гэтым кірунку пэўную работу з камітэтамі камсамола факультэтаў і некаторымі камсоргамі курсаў і груп. Пры камітэце пастаянна працуе школа камсамольскага актыву, якая ставіць сваёй мэтай навучыць працаваць сакратароў курсаў, груп і членаў камітэтаў камсамола факультэтаў.

З снежня пленум камітэта камсамола абмяркоўвае пытанне аб кіраўніцтве камітэтамі камсамола факультэтаў работай у групах і на курсах, дзе камсамольскі актыў зможа абмяняцца вопытам работы і намеціць на будучае пытанні, якія неабходна будзе падняць.

Але калі чакаць толькі ўказанняў зверху, то сапраўднай работы не будзе.

Мы рэкамендуем праводзіць больш тэматычных сходаў. Гэта звычайна дае добрыя вынікі. Днямі я прысутнічаў на камсамольскім сходзе 3 курса геаграфічнага факультэта. Камсамольскае бюро і яго сакратар Валянціна Зіневіч вельмі сур'ёзна адносіцца да яго правядзення. Павестка дня сходу «Пагаворым аб сябе» была аб'яўлена задоўга да сходу. Пытанне прыцягнула ўвагу ўсіх камсамольцаў, хоць здавалася, што нічога асаблівага ў ім не было — проста бюро нацэльвала камсамольцаў пагаварыць аб сябе ж.

Выступае Люда Міронава. Яна паравялася на стацыянар з завочнага аддзялення, ёй цяжка ліквідаваць разрыў у ведах, праграмы ж розныя! Цяжка, напрыклад, асвоіць картаграфію без дапамогі таварышаў. Але калі яна звярнулася за дапамогай да Міхаіла Бокшы, той толькі пасмяяўся над «невучам». Зразумела, іншыя таварышы дапамаглі. А дзе ж тваё сумленне, Міхаіл? Можа, ты турбуешся толькі аб сабе?

Хутка падыходзіць да трыбуны Люда Бязручка, якая гаворыць аб калектыве на курсе, даклад ней пра тое, што, маўляў, няма калектыву, кожны хвалюецц толькі за сябе. З абурэннем гаворыць яна аб Жоры Рудштэйну, Мішы Бокшы, Яўгену Самайлозічу, заўважае, што нават цяпер, на сходзе, яны размаўляюць аб чымсьці. Значыць, іх не хвалюе размова. Яны не прымаюць блізка да сэрца словы таварышаў.

Барыс Салагуб і Валя Сыцько падымаюць пытанне аб культуры паводзін, аб сціпласці. Гэтых рыс не хапае ў характары Чухновай і Рудаковай.

Выступаючыя падыходзілі да трыбуны адзін за адным. Сход зацягнуўся, ператварыўся ў дыспут. Спрачаліся аб калектывізме і культуры паводзін, аб дысцыпліне і гонары, аб сціпласці.

Сход вынес такую пастанову: «1. У нас на курсе павінен быць адзін лозунг «Адзін за ўсіх, усе за аднаго». 2. Няхай на курсе не будзе раўнадушных!».

Няхай на сходзе некаторыя аратары гаварылі не зусім правільна, але такія размовы дапамагаюць нам усім. Няхай некаторыя і рабілі выгляд, што гэтыя размовы іх не цікавяць, але словы таварышаў пасеялі ў іх душы сумненне: а ці правільна мы робім?!

Уладзімір АТРОШЧАНКА,
нам. сакратара камітэта камсамола БДУ.

КОРАТКА

□

Пазаўчора адбыўся агульны справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта.

□

24 лістапада адбылося пасяджэнне бюро камітэта камсамола універсітэта. На павестцы дня: стаялі два пытанні: 1. Аб рабоце дружыны біялагічнага факультэта. 2. Аб вывучэнні грамадскіх дысцыплін на хімічным факультэце і ролі камітэта камсамола факультэта.

□

У мінулую суботу на сцэне актавай залы корпуса гуманітарных факультэтаў адбылася другая пастаноўка п'есы Эдуардо дэ Філіпа «Злодзей у раі».

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

А Б' Я В А

3 снежня ў 18 гадзін у 433 аўдыторыі галоўнага корпуса адбудзецца пленум камітэта ЛКСМБ універсітэта

Павестка дня:

1. Аб рабоце ў камсамольскіх групах і кіраўніцтве гэтай работай камітэтамі камсамола факультэтаў.

2. Арганізацыйны момант.

Запрашаюцца групоргі, члены курсавых бюро, члены камітэтаў камсамола факультэтаў і куратары.

Камітэт камсамола БДУ

ТАВАРЫШЫ СТУДЭНТЫ!
ВЫПІСВАЙЦЕ І ЧЫТАЙЦЕ
«ЧЫРВОНУЮ ЗМЕНУ»!

Падпісная цана:
на 3 месяцы—1 руб. 32 кап.,
на 6 месяцаў—2 руб. 64 кап.,
на год—5 руб. 28 кап.

Падпіска прымаецца без абмежаванняў.

Адрас рэдакцыі: *Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212.* Тэл. *2-07-19.* *Друкарня Белсавпрофа.* Зак. 3440. АТ 15705